*І.Л.КОГАН*

# ЭТНАПСІХАЛАГІЧНАЯ СТРУКТУРА І КУЛЬТУРНАЯ ДЫНАМІКА

Цікавасць да этнапсіхалогіі ў сучасным навуковым разуменні ўзнікла не выпадкова, прынамсі ў нашай краіне. Час і навейшы вопыт ваенных канфліктаў пераконваюць, што этнічная псіхалогія шмат ў чым уплывае на неўсвядомленыя і часта разбуральныя дзеянні вялікіх этнічных калектываў. Мы будзем весці размову не аб уласна этнічнай псіхалогіі, а аб яе ўплыве на культурную дынаміку і ўзаемаадносіны з ёй. Гэтае пытанне яшчэ мала вывучана, яно ўяўляе цэлы комплекс праблем, звязаных як з паводзінамі чалавека, так і з глыбіннымі заканамернасцямі яго ўдзелу ў сацыяльных і культурных узаемадзеяннях на ўзроўні вялікай сацыяльнай групы і цэлага народа.

Нормы сацыяльных узаемадзеянняў, з’яўляючыся культурнымі формамі, ствараюць напрамкі сацыяльнага працэсу, якія запаўняюцца новымі сацыяльнымі кантактамі ў якасці зместу культурнага працэсу. Праблема заключаецца ў тым, што гісторыя чалавецтва ўключае паступовы дэмаграфічны працэс. Колькасць людзей на зямлі пастаянна павялічваецца (за выключэннем некаторых перыядаў “дэмаграфічнага застою”). Аднак калі мы маем на ўвазе сацыяльныя ўзаемадзеянні як змест культурнага працэсу, то гэты змест зусім не абыякавы да колькасці ўзаемадзеянняў у адзінку часу. Праўда, колькасць узаемадзеянняў можа разглядацца і дыяхранічна, г. зн. у гістарычным аспекце, што таксама садзейнічае атрыманню этнасам вопыту і стварэнню культурных формаў як носьбітаў этнакультурнай інфармацыі. Але, з нашага пункту гледжання, гэты працэс міжпакаленнага ўзаемадзеяння значна менш эфектыўны для павелічэння колькасці вопыту (гістарычна, культурна значымага), чым працэс шматлікіх сацыяльных узаемадзеянняў, што адбываюцца адначасова.

Мы не можам пабудаваць такую мадэль, якая б магла дапамагчы ўявіць нам, да чаго прыйшла б наша цывілізацыя, калі б у часы верхняга палеаліту жылі не некалькі соцень тысяч чалавек на ўсёй зямлі, а хаця б некалькі соцень мільёнаў. Хутчэй за ўсё верхняга палеаліту не было б. Але такая наша гісторыя, і любы прагноз мінулага пры змене яго ўмоў даволі абстрактны і залішні. Мы маем тое, што маем сёння. А сёння мы назіраем, як хуткасць сацыяльных узаема-дзеянняў павялічваецца, колькасць тэхнічных адкрыццяў узрастае ў геаметрычнай прагрэсіі кожныя некалькі месяцаў (у маштабе ўсёй планеты), а колькасць вопыту цывілізацыі, асабліва ў развітых культурах, дае магчымасць адносна маладому чалавеку валодаць такім аб’ёмам ведаў, аб якіх гадоў сто таму не марыў і прафесар. Мы мяркуем, што гэтыя працэсы амаль цалкам залежаць ад колькасці людзей, якія ўдзельнічаюць ва ўзаемадзеяннях, і ў залежнасці ад іх накіраванасці развіваюцца тыя або іншыя сферы культуры.

Нашы апаненты часта заяўляюць аб істотным значэнні якасці сацыяльных узаемадзеянняў і якасці тых умоў сацыякультурнага асяроддзя, у межах якіх назапашваецца культурны вопыт. На гэта мы адказваем, што і ўмовы таксама ў сваю чаргу былі выкліканы адказам грамадства на колькасныя змены, якія вядуць да якасных, напрыклад павелічэнне колькасці вопыту сацыяльнай групы і дэмаграфічны рост. Падобныя колькасныя накапленні не бясконцыя, яны маюць крытычныя парогі сваіх велічынь, пасля пераадолення якіх культурныя працэсы набываюць іншую якасць. Да таго ж культуральная дэмаграфія [1] пакуль не мае дакладных канстант залежнасці якасных паказчыкаў сацыякультурнага працэсу ад яго колькасных характарыстык. У дадзены момант культуральная дэмаграфія ставіць перад сабой задачу атрымаць больш дакладныя апісальныя крытэрыі культурных працэсаў і іх вынікаў з дапамогай колькасных характарыстык грамадства. Да такіх характарыстык адносяцца амаль не вывучаныя ў сваім уплыве на культурнае развіццё грамадства маштаб тэрыторыі, дзе жыве этнас, і колькасць этнічна і тэрытарыяльна звязаных паміж сабой людзей. Абодва гэтыя аспекты цікавыя для нас у дадзены момант у сваім псіхалагічным вымярэнні, непасрэдна звязаным з дынамікай культурнага працэсу ў цэлым.

У гэтым артыкуле мы не будзем разглядаць фундаментальныя пытанні філасофскага кірунку, у прыватнасці пытанне, што адносіцца да прадмета філасофіі культуры, але

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сказаць некалькі слоў аб адным з такіх пытанняў лічым неабходным, каб абазначыць напрамак нашых пошукаў. Гаворка ідзе аб глыбінным пытанні ўсякай філасофіі суадносін існага і станаўлення. Для рашэння гэтага пытання мы не будзем прыцягваць даныя аб тым, як яго разглядалі многія выдатныя мысліцелі нашай планеты. Кожная з вядомых сёння культур мінулага і сучаснага валодае унікальнымі вынікамі даследаванняў у гэтай галіне, але канчатковага рашэння так ніхто і не атрымаў, напэўна, у сувязі з прынцыповай немагчымасцю звесці верагодны адказ да абсалютнай адназначнасці. У межах культуралогіі або сучасных гуманітарных навук наогул, якія знаходзяцца пад алгарытмам культуралагічнай парадыгмы, такі адказ тым больш немагчымы і нават абсурдны.

І ўсё ж трэба ўдакладніць, што разумеецца пад суадносінамі існага і станаўлення. Кожны аб'ект мае пэўныя індывідуальныя прыметы, якія робяць яго не толькі унікальным, але і дазваляюць распазнаваць на працягу ўсяго перыяду існавання. У гэты перыяд дадзены аб'ект мяняецца, змены паступова памнажаюцца і відазмяняюць яго, хаця і пасля аб'ект застаецца як бы самім сабой. З філасофскага пункту гледжання аб'ект з'яўляецца і не з'яўляецца самім сабой адначасова. Напрыклад, чалавек ад нараджэння да смерці падвергнуты незваротным зменам як фізічнага цела, так і псіхікі, і тым не менш ён застаецца самім сабой у пэўным невытлумачальным для нас сэнсе, маючы адны і тыя ж імя і прозвішча [2]. У дзяцінстве ён марыць аб тым, калі будзе дарослым, хаця гэта будзе ўжо зусім іншы чалавек; будучы старым, не задумваючыся, ідэнтыфікуе сябе з самім сабой у дзяцінстве, ужываючы без сумнення слова "я", хаця чалавек, які глядзіць збоку, не знойдзе ў гэтых двух індывідуумах амаль ніякіх агульных рыс.

У ХХ ст. структуралісты, прыхільнікі так званага структурна-функцыянальнага метаду [3], сцвярджалі, што старая праблема існага і станаўлення ў сучаснай інтэрпрэтацыі гучыць у наступнай антыноміі: структура аб'екта нязменная, але знаходзіцца ў стане ўнутранага і знешняга руху (працэсу). Пад унутраным рухам разумееца не што іншае, як эвалюцыя аб'екта, набыццё ім дадатковых якасцей, якія ў рэшце рэшт вядуць да поўнага відазмянення аб'екта як цэлага. Але даць дакладнае азначэнне таго, што эвалюцыянiруе ў аб'екце, а што застаецца без змен, ніхто да гэтага часу так і не змог. А тое, што некаторая частка аб'екта павінна застацца без змен, відавочна, інакш мы не змаглі б яго пазнаць і атаясаміць адзін і той жа аб'ект у розны час: без нязменных унутраных прымет аб'ект не можа заставацца самім сабой і будзе вечна пераходзіць у нешта іншае, зліваючыся з ім без астатку.

У адносінах да аб'екта гуманітарных навук, і ў прыватнасці сацыялогіі і культуралогіі, гэтае пытанне набывае дадатковую складанасць. На першы погляд можа паказацца, што, наадварот, выявіць нязменную частку сацыякультурнага працэсу, які з'яўляецца галоўным аб'ектам гуманітарных навук [4], не так ужо складана: чалавек застаецца чалавекам як раней, у першабытнай абшчыне, так і сёння, а сацыякультурны працэс мяняецца. Але мы забываем пра тое, што працэс жыццядзейнасці чалавека вядзе да аб'ектывацыі сацыяльных і індывідуальных патрэбнасцей, г. зн. стварае сацыякультурнае асяроддзе са спецыфічнай прасторай і штучна выпрацаванымі прадметамі. Яны, у сваю чаргу, моцна ўздзейнічаюць на чалавека і змяняюць яго не толькі псіхалагічна, але нават і фізіялагічна. Таму рэальна мы маем два аб'екты — чалавека і культуру, якія пастаянна мяняюцца адзін з адным ролямі, а правільней сказаць, што яны абодва аднačасова з'яўляюцца суб'ектам і аб'ектам, і аналізаваць іх паасобку можна толькі з агаворкай аб тэарэтычных мэтах такога даследавання. Менавіта гэта мы маем на ўвазе, прыступаючы да разгляду ўзаемаўплыву чалавека (у яго разных вымярэннях) і культуры.

Метадалагічная перадумова дадзенага даследавання фармальна даволі простая. Па-першае, чалавек, нават калі ён у псіхалагічным вымярэнні з'яўляецца інтравертам, замкнёнай у сабе асобай, або эгаістам, не здольны існаваць па-за грамадствам. Паняцце жыццёвай прасторы чалавека толькі ў некаторай ступені абапіраецца на ўласцівую асобнаму індывіду здольнасць пачуццёвага ўспрымання, але формы гэтага ўспрымання, як і частка асяроддзя, што інфармацыйна сілкуе яго, развіваюцца толькі пры дапамозе сацыяльнага ўзаемадзеяння. Такім чынам, па-другое, нягледзячы на знешнюю адасобленасць чалавека (яго цела і той часткі псіхікі, якая апрацоўвае звязаную з ім інфармацыю), у ім дзейнічаюць пэўныя псіхалагічныя структуры, так або інакш

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абумоўленыя яго сацыяльным і культурным асяроддзем. Гэтыя псіхалагічныя структуры, мабыць, і складаюць тое нешта нязменнае, што дазваляе ідэнтыфікаваць чалавека ў якасці самога сябе на працягу свайго зменлівага жыцця. Выяўленне і апісанне гэтых структур, якія, ня-гледзячы на магчымасць фармальных і змястоўных змен, адносяцца да ролі суб’екта ў чалавеку, дадуць нам магчымасць устанавіць значэнне тых колькасных фактараў грамадства, да якіх мы аднеслі маштаб населенай тэрыторыі і колькасць этнічна звязаных людзей, што на ёй жывуць.

Перш за ўсё неабходна прызнаць той факт, што цела з’яўляецца асновай псіхалагічнай ідэнтыфікацыі чалавека з самім сабою і асобным ад усяго навакольнага свету [5].

Тут дыхатамія Фіхтэ “я” — “не-я” грунтуецца перш за ўсё на ўспрыманні чалавекам самога сябе як свайго цела. Зразумела, факт цела не адразу ўсведамляецца дзіцем, як і ўсё астатняе, але цела ў якасці аб’екта, якім бы ў чарговасці сярод аб’ектаў ні стаяла, з’яўляецца нязменнай асновай ролі суб’екта ў чалавеку. Другім фактам псіхалагічнага значэння з’яўляецца наяўнасць розных па ўзроўні і ступені ўсеагульнасці структур, што адказваюць за захаванне мяжы паміж “я” і светам, у выніку дзеяння якіх гэта мяжа пастаянна перамяшчацца: яна то звужае, то пашырае аб’ём жыццёвай прасторы, аддаючы яе соцыуму або захопліваючы новыя тэрыторыі ў культурнай (сацыяльнай) прасторы. Гэтыя структуры дэтэрмінаваны прыродным і сацыякультурным асяроддзем пражывання чалавека, паколькі яны адносяцца да яго сацыяльнай іпастасі.

Чалавеку ўласціва параўноўваць сябе са светам і асабліва з падобнымі сабе. Хейзінга на добра падабраным матэрыяле прадэман-страваў невыкараняльнае імкненне кожнага чалавека, у межах якой бы культуры мінулага або сучаснасці ён ні жыў, спаборнічаць з кім-небудзь за права быць або хаця б называцца лепшым, больш моцным, разумным, прыгожым. З дзяцінства чалавек параўноўвае свае магчымасці з магчымасцямі равеснікаў і дарослых, не прызнаючы тых, хто слабей, і беручы сабе за прыклад таго, кім ён сам хацеў бы стаць (безумоўна, лепш за самога сябе). Па сцвярджэнні Хейзінга, аганістычны элемент наогул уласцівы культуры як цэламу. Інакш кажучы, калі разумець пад культурай форму чалавечага існавання, чалавеку ўласціва спасцігаць сваё акружэнне цераз прызму яго параўнання з самім сабою. Пры гэтым нават гульнёвы характар такога параўнання звязаны, як лічыць Хейзінга, з экзістэнцыяльнымі праблемамі чалавека і накіраваны на высвятленне ім сваёй ролі ва ўсеагульным сусветным працэсе.

Паралельна з гэтым ідзе працэс пазнання свету і самапазнання, які, верагодна, з’яўляецца фонам для аганістычнага працэсу, што сцвярджае чалавека дастойным членам сацыяльнага акружэння. Прычым пазнанне свету пачынаецца не інакш, як з выпрабавання сябе ў свеце. Напрыклад, чалавек, абпаліўшы руку, разумее сілу і небяспеку агню. Любая прыродная з’ява, як і з’ява сацыяльнага асяроддзя, праходзіць своеасаблівую апрабацыю з дапамогай сродкаў успрымання чалавека, г. зн. пачуццёвага апарату. Няма сумненняў у тым, што іерархія з’яў грунтуецца першапачаткова на ацэнцы сілы, магутнасці і маштабу дадзенай з’явы ў параўнанні з магчымасцямі чалавека. Як нам ужо даводзілася адзначаць, менавіта з гэтымі кагнітыўнымі працэсамі звязаны і такі асноватворны для псіхікі і культуры феномен, як рэлігія і рэлігійнасць. Уведзенае намі паняцце “рэлігійная адлегласць” накіравана менавіта на спасціжэнне псіхалагічнай дыстанцыі паміж вобразам чалавека (якім ён уяўляецца самому сабе) і з’явай свету (або трансцэндэнтнай істотай, “выведзенай” рацыянальна) [6]. Сярод асноўных псіхалагічных перадумоў рэлігіі была вылучана наступная: чалавек пастаянна выпрабоўвае важнейшыя з’явы свайго акружэння і высвятляе здольнасць яго кантролю [7]. Тая з’ява, якая не залежыць ад чалавека і вызначае яго жыццё, становіцца з’явай з экзістэнцыяльным вымярэннем і ўжо належыць да так званай “свяшчэннай сферы”.

Па сутнасці ўсе прадметы, з’явы і факты асяроддзя, якое акружае чалавека, структуруюцца ў яго свядомасці ў іерархічным парадку значэнняў, што ў цэлым ужо ўяўляе сабой светаразуменне.

У дадзеным выпадку для нас асабліва важнай выступае праблема ідэнтыфікацыі чалавека як вобраза ў шэрагу вобразаў усіх сусветных з’яў, якія складаюць яго навакольны свет. Размова ідзе аб тым, што, паколькі чалавечае “я” мае пэўную структуру,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

г. зн. нязменныя індывідуальныя прыметы, неабходна зразумець змест узроўняў гэтай структуры, з аднаго боку, і ступень іх уплыву на выяўленне значэнняў з'яў навакольнага асяроддзя чалавека, з другога.

Што чалавек разумее пад паняццем і вобразам "я"? Безумоўна, сваё цела і сябе як асобу, г. зн. як члена калектыву, тое, чым адно і другое валодаюць (сілай, маёмасцю, сацыяльным статусам і інш.), і свае магчымасці ў двух галоўных вымярэннях — фізічным і сацыяльна-культурным. Фізічная сіла, зразумела, з'яўляецца асновай для нараджэння псіхалагічнага вобраза "я", але дабудаваць гэты вобраз можна толькі праз параўнанне сваіх фізічных магчымасцей з іншымі людзьмі, г. зн. сацыяльным асяроддзем. На частцы вобраза "я", звязанай з фізічнымі магчымасцямі, надбудоўваецца другая, якая з дапамогай параўнальнай ацэнкі ўтрымлівае інфармацыю аб чалавеку ў плане сацыякультурнага статусу асобы.

Маецца на ўвазе, што чалавек ацэньвае свае творчыя і сацыяльныя магчымасці цераз прызму тых сфер культуры, у межах якіх магчыма рэалізацыя асобы ў дадзены культурна-гістарычны перыяд. Так, у старажытных цывілізацыях чалавек павышаў свой сацыяльны статус, авалодваючы некаторымі прэстыжнымі прафесіямі, такімі як воін, рамеснік, гандляр, філосаф або палітык. У наш час такіх магчымасцей значна больш. Але гэта ўсё адносіцца да асобы, якая адчувае сябе часткай сваёй сацыяльнай групы. Нас жа цікавіць пытанне аб тым, якія межы і прыметы мае тая псіхалагічная рэальнасць, што звязана з паняццем і вобразам "мы", уваходзячым у склад вобраза "я".

Паняцце "мы" шматузроўневае. Асоба ўваходзіць у розныя адзінствы, якія валодаюць пэўнай ступенню ўсеагульнасці, напры-клад сям'я, прафесійны калектыў, канфесія, партыя і інш. Але ва ўсіх элементаў гэтых псіхалагічных структур ёсць агульная аснова, і яна дае магчымасць ім суіснаваць. Такой асновай з'яўляецца этнас.

Існуе шмат азначэнняў этнасу. Мы можам прапанаваць тую частку, якая, на нашу думку, характарызуе яго найбольш агульна: "Этнас — гэта прыродна-сацыяльная агульнасць людзей, што пражываюць на адной тэрыторыі, вядуць адзіную гаспадарку і выкарыстоўваюць агульныя для кожнага члена нормы, каштоўнасці і ідэалы ў якасці напрамку культурнага працэсу". Адзінства прыродных, сацыяльных і культурных умоў існавання на працягу многіх дзесяцігоддзяў, стагоддзяў і нават тысячагоддзяў стварае псіхагенетычна перадаваемую структуру псіхалагічнай роднасці, якая дзейнічае на аснове кроўна-роднасных адносін. У далейшым мы будзем называць гэтую структуру *этнапсіхалагічнай*.

Этнапсіхалагічная структура з'яўляецца па сутнасці той псіхалагічнай рэальнасцю, якая стваралася на працягу многіх тысячагоддзяў першабытнай формы існавання чалавецтва, прайшла стадыі радавых абшчын і плямёнаў і дасягнула сваёй спеласці толькі ў канцы верхняга палеаліту — пачатку неаліту (XV—VIII тысячагоддзі да н. э.). Менавіта тады тэрытарыяльныя і кроўна-роднасныя формы адзінства перараслі ў этнічныя арганізмы з устойлівай культурнай традыцыяй і больш-менш яснымі ідэаламі. З гэтага часу склалася этнапсіхалагічная структура, якая стала сувязной асновай для асобнага індывідуума пры яго ўваходжанні ў склад любой калектыўнай агульнасці людзей. Вось ужо на працягу X—XV тысячагоддзяў этнапсіхалагічная структура ўяўляе нераскладальную аснову ўдзелу чалавека ў жыцці сацыяльнай групы рознага маштабу і часу свайго існавання. Гэта менавіта тая рэальнасць, дыферэнцыяцыя якой у гісторыі прывяла да вялікай разнастайнасці сацыяльных груп і субкультур, у іх удзельнічае сёння чалавецтва.

Можна канстатаваць, што паняцце "мы" мае структуру, дзе элементы валодаюць рознай ступенню ўсеагульнасці, але ўключэнне асобы ў этнічную агульнасць складае псіхалагічную аснову ўсякай формы чалавечай сацыяльнасці. (Тут апускаецца факт наяўнасці таго псіхалагічнага фону, які характарызуе чалавечы род наогул як жывых істот у іерархіі фізічнага і біялагічнага ўзроўняў свету.) Калі ўявіць чалавечую псіхіку ў выглядзе пірамiды, раздзеленай рознымі па таўшчыні гарызантальнымі пластамі, тады фундаментам будзе этнапсіхалагічная структура, а вяршыняй — індывідуальнасць чалавека, заснаваная на факце асобнасці чалавечага цела; сярэднія ж пласты будуць

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

сімваламі тых прасторава-часавых калектываў і груп, якія існуюць у грамадстве і часткай якіх з’яўляецца чалавек на працягу свайго жыцця [8].

Ужо не раз указвалі сацыяльныя псіхолагі на наяўнасць незнішчальнай антыноміі ў свядомасці любога чалавека “свае — чужыя”. Для нас гэтая антыномія неабходна толькі для таго, каб сказаць наступнае: чалавек як частка этнасу (этнапсіхалагічная структура) ацэньвае сам этнас толькі ў проціпастаўленні яго з другім і навакольным светам у цэлым. З гэтага пункту гледжання паняцце “размер” мае, як нам падаецца, вельмі важную ролю ва ўспрыманні чалавекам самога сябе і “свайго” этнасу цераз прызму яго “сілавых” магчымасцей.

Псіхолагі даўно звярнулі ўвагу на асаблівасці фарміравання “я-вобраза” ў дзяцей. Большасць з іх, асабліва хлопчыкі, вызначаюць сваю сілу або сілу іншага, зыходзячы з параўнання размераў цела або зброі: чым яны большыя, тым мацнейшыя. Зразумела, з узростам у самаацэнку ўключаецца рацыянальны аналіз многіх дадатковых якасцей і ўмоў павелічэння сілы і магчымасцей. Але, па-першае, самаацэнка дарослага таксама працягвае грунтавацца на аснове параўнання сябе з іншымі людзьмі і іх здольнасцямі, а па-другое, псіхалагічны факт размеру (аб’ёму, маштабу, г. зн. колькасная прымета) працягвае адыгрываць, можа быць не зусім свядома, адну з ключавых ролей у любым параўнальным аналізе і ацэнцы [9].

Чалавек якога-небудзь племені не можа ацаніць яго сілу без параўнання знешніх прымет свайго племені з другім. Аб’ём тэрыторыі пражывання і колькасць членаў племені (этнасу, дзяржавы) не проста вымяраюцца самі па сабе, а ў супастаўленні з такімі ж паказчыкамі іншых плямён. І калі гэтыя паказчыкі вышэй, чым у суседзяў, то, акрамя адчування перавагі, якое можа натуральна ўзнікнуць у чалавека, у ім узмацняецца ўпэўненасць у сіле свайго этнічнага арганізма. А гэта, у сваю чаргу, псіхалагічна праламляецца ў перакананасць правільнасці этнічнага парадку, прыхільнасці багоў да племені, да веры, у сапраўднасць этнічных нормаў, каштоўнасцей, звычаяў і ідэалаў, што адносяцца да экзістэнцыяльных перажыванняў індывіда (пытанні аб сэнсе жыцця, аб замагільным лёсе, сваёй ролі ў свеце і інш.). Па сутнасці гаворка ідзе аб умацаванні этнапсіхалагічнай структуры, якая, з’яўляючыся фундаментам усёй піраміды чалавечай псіхікі і сацыяльнасці чалавека, трансліруе гэтую псіхалагічную аперацыю ў іншыя іерархічныя пласты яго групавой свядомасці ў якасці сілавога, энергетычнага кампанента. Інакш кажучы, чалавек лепш і больш старанна працуе ў калектыве, удзельнічае ў справах партыі або вучыцца ў школе і ВНУ, калі ён упэўнены ў сіле сваёй краіны, у яе магчымасці адстаяць сваю незалежнасць і нават у здольнасці да заваёў [10].

Узмацненне этнапсіхалагічнай структуры адбываецца, як мы адзначалі, на фоне параўнання асноўных колькасных параметраў з такімі ж параметрамі іншых краін і народаў. Так, можна прывесці прыклад з жыцця сучаснай Расіі. Расійская Федэрацыя, якая ўступае па многіх ключавых пазіцыях не толькі ЗША, Японіі і іншым развітым краінам, лічыцца асноўнай масай расіян вялікай краінай менавіта па прычыне яе вялікай тэрыторыі, іншыя лічаць яе вялікай дзякуючы колькасці насельніцтва, а некаторыя — дзякуючы колькасці боегаловак. Спецыялісты ў сферы эканомікі, палітыкі, фінансаў і іншых сфер лічаць такую ўпэўненасць народа недасведчанасцю. Мы ж сцвярджаем, што ацэнка магчымасцей краіны, яе сілы цераз прызму маштабу тэрыторыі і колькасці насельніцтва належыць да асноўнай і невыкараняльнай структуры псіхікі, звязанай з этнічным пачуццём. Гэтыя параметры з’яўляюцца першаснымі данымі, якія ацэньваюцца народам у параўнанні з іншымі, таксама як і чалавек ацэньвае свае магчымасці на аснове параўнання размеру свайго цела і яго фізічных магчымасцей з агульнапрынятай нор- май [11].

Такім чынам, этнапсіхалагічная структура — гэта прызма псіхалагічнай рэальнасці, праз якую чалавек атаясамлівае сябе з этнасам і ацэньвае свае магчымасці ў межах этнакультурных магчымасцей. Тая частка вобраза “я”, што складае ўзровень этнічнага “мы”, па сутнасці вызначае “я” як цэлае, як асобу (актуальную і будучую) у межах этнічных магчымасцей: усё, што даступнае этнасу, даступна і мне. У гэтым сэнсе этнапсіхалагічная структура можа разглядацца і быць зразумелай у якасці энергетычнай крыніцы культурнага працэсу этнасу і ўдзелу ў гэтым працэсе чалавека.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Тут неабходна адзначыць наступнае. Паняцце “мы” фарміруецца ў чалавеку дзякуючы шматлікім сацыяльным узаемадзеянням рознай ступені ўсеагульнасці, у якіх ён удзельнічае актыўна або пасіўна. Самі ўзаемадзеянні могуць характарызавацца па колькасці ў адзінку часу, па ступені інтэнсіўнасці, па якасці (накіраванасці) і хуткасці працякання. Апісанне гэтых прымет сацыяльных узаемадзеянняў не з’яўляецца мэтай дадзенага артыкула, таму мы апускаем яго. Падкрэслім толькі істотную дэталь: чым больш у параўнанні з іншымі сацыяльных узаемадзеянняў унутры этнічнай групы, тым больш змястоўным і эмацыянальна напружаным будзе паняцце “мы”. Якая ж роля гэтага паняцця для творчасці індывідуума і для культурнага працэсу ў цэлым?

Памятуючы думку Арыстоцеля аб чалавеку як сацыяльнай жывёле, неабходна канстатаваць невыкараняльную сацыяльнасць чалавека. Паняцце “мы” адрозніваецца толькі па ступені напружанасці яго эмацыянальнага перажывання і маштабе, але адсутнічаць у чалавека не можа. Як ужо адзначалася, маштаб паняцця “мы” фарміруецца дзякуючы колькаснаму параўнальнаму супастаўленню “свайго” і “чужога” этнасаў, а яго эмацыянальная напружанасць забяспечваецца колькасцю сацыяльных узаемадзеянняў і іншымі прыметамі. Лічым мэтазгодным падзяляць творчасць на “творчую сітуацыю” і “творчы працэс”, або працэс тварэння. Апошні непасрэдна залежыць ад творчай сітуацыі, г. зн. працэс непасрэдна залежны ад тых умоў, у якія трапляе суб’ект у пачатку руху. Таму мы лічым, што паняцце “мы” ў чалавеку і ёсць пачатковая ўмова творчасці, інакш творчая сітуацыя, якая дае шэраг механізмаў тварэння, пры гэтым не толькі выбар кірунку гэтага тварэння, але і энергетычнае забеспячэнне ўсяго творчага працэсу аж да атрымання канкрэтнага выніку. Праз паняцце “мы” індывід ацэньвае “сілавыя” і “творчыя” магчымасці свайго этнасу, а праз механізм этнічнай ідэнтыфікацыі падсвядома пераносіць гэтую ацэнку на самога сябе як частку да- дзенага этнічнага арганізма.

На аснове лагічнага вываду з вышэйсказанага можна сцвярджаць, што паколькі існаванне групы істотна характарызуецца сацыяльнымі ўзаемадзеяннямі, прыроднымі і этнічнымі прыметамі, якія выступаюць умовамі творчага працэсу ў чалавеку, пастолькі само быццё сацыяльнай групы ўяўляе ўстойлівы стан творчай сітуацыі. Праз этнапсіхалагічную структуру ў паняцці “мы” кожны індывід удзельнічае ў стварэнні гэтай сітуацыі і адначасова з’яўляецца яе патэнцыяльным спажыўцом, г. зн. суб’ектам творчасці. Якасць сацыяльных узаемадзеянняў забяспечваецца сацыяльнай стратыфікацыяй на адносна ўстойлівыя сацыяльныя групы людзей са сваімі нормамі і ідэаламі. Індывіду заўсёды прапануецца выбар напрамку яго ўключэння ў творчы працэс праз уваходжанне ў тую або іншую сацыяльную групу дадзенага этнасу. У гэтым выпадку індывідуальны творчы працэс можа разумецца як элемент зместу творчага працэсу цэлага грамадства, г. зн. як элемент культурнага працэсу.

Паняцце этнапсіхалагічнай структуры выступае асновай, умовай удзелу чалавека ў сацыяльных узаемадзеяннях, у якіх ацэнка этнічнага арганізма і этнічная ідэнтыфікацыя з яго творчымі магчымасцямі (у тым ліку і сілавымі) ствараюць творчую сітуацыю ў соцыуме, а сацыяльныя групы, прафесійныя калектывы і іншыя аб’яднанні забяспечваюць сродкі і механізмы рэалізацыі творчага патэнцыялу індывіда. Удзел апошняга ў культурным працэсе грамадства ўяўляецца па сутнасці толькі ў валявым акце выбару накіраванасці сваёй творчасці (хаця ў выключных выпадках геніяльныя здольнасці чалавека могуць дазволіць яму ствараць не толькі ўласныя механізмы творчага працэсу, але і цэлы творчы напрамак, які ў культуралогіі прынята называць культурнай формай).

Такім чынам, этнапсіхалагічная структура ляжыць у аснове этнічных і культурных працэсаў, здзяйсняючы дынамічную сувязь паміж чалавекам і этнасам, а таксама творчай дзейнасцю індывіда і этнакультурнай дынамікай у цэлым. Этнапсіхалагічная структура выступае ў якасці рэгулятара каштоўнасных і нарматыўных арыентацый чалавека, які выбірае правільны, сугучны этнакультурнай традыцыі напрамак сваёй культурнай дзейнасці і яе сэнсавую інтэрпрэтацыю. Значыць, этнапсіхалагічная структура з’яўляецца сэнсаўтваральным цэнтрам этнічнай культурнай прасторы і цэнзарам этнічных сацыякультурных працэсаў.

---

1. Культуральная дэмаграфія — новая навуковая дысцыпліна прыкладнога характару, распрацоўваемая аўтарам, якая выкарыстоўвае дэмаграфічныя паказчыкі для аналізу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стану культуры. Гл. аб гэтым: *Коган И.Л.* Культуральная демография // Социология. — 2002 . — № 1.

2. Мы мяркуем, што філасофія імені можа мець вырашальную ролю, менавіта абгрунтаваць тое, што, дзякуючы называнню фактаў свядомасці, атрымала магчымасць пазнання як такога: імя з'яўляецца сродкам сувязі мноства прымет, функцый, рыс аб'екта, ствараючы ілюзію яго нязменнасці і унікальнасці, нягледзячы на зменлівасць асобных элементаў. Успамінаючы Геракліта, можна пагадзіцца, што, магчыма, увайсці ў адну раку двойчы нельга, але, тым не менш, гэта ўсё ж "адна і тая ж рака": назва дае магчымасць ідэнтыфікаваць аб'ект як "адзін і той жа", хаця ён і мяняецца ў часе.

3. Адзін з заснавальнікаў гэтага метаду ў галіне гуманітарных навук Парсанс лічыў, што напружанне стварае не супрацьпастаўленне "структура — функцыі", а "стуктура — працэс".

4. Мы свядома пераносім акцэнт з чалавека як аб'екта вывучэння гуманітарных навук на сацыякультурны працэс, каб падкрэсліць дынамічны характар чалавека, і не разглядаем абстрактнага чалавека, па-за культурным рухам не існуючага.

5. Псіхалогія культуры зрабіла яшчэ вельмі мала для культуралагічнага спасціжэння фактаў чалавечай псіхікі, у тым ліку і тых, што адносяцца да глыбінных біялагічных працэсаў у чалавеку.

6. Падрабязней гл.: *Коган И.Л.* Этнопсихологические основания культурогенеза. — Мн.: Ин-т современных знаний, 2001.

7. Гл.: *Коган І.Л.* Рэлігіязнаўства: псіхалагічны і культуралагічны аспекты рэлігіі // Народная асвета. — 2001. — № 5.

8. Мы не разглядаем тут імкненне чалавека заняць больш выгадную сацыяльную пазіцыю або пануючую ролю ў розных сацыяльных групах аж да ўзроўню этнасу ў цэлым (як палітычнага арганізма). Наша задача заключаецца ў тым, каб указаць на дзве важнейшыя з улікам зместу артыкула прыметы этнасу, якія праламляюцца ў чалавечай свядомасці пэўным чынам і адыгрываюць асноватворную ролю ў сацыякультурным жыцці асобы.

9. Магчыма, тут значную ролю адыгрывае факт таго, што зрок (наогул пачуццёвае ўспрыманне) мае ў колькасным аналізе асноватворную ролю: 80 % усёй інфармацыі, якая паступае да чалавека, успрымаецца з дапамогай зроку, пасля чаго колькасныя і знешнія прыметы прадметаў становяцца аб'ектам рацыянальнага аналізу і ацэнкі.

10. Апошняе важна толькі ў якасці тэарэтычных ведаў, мадэлі, праецыруемай на будучае сваёй краіны і, значыць, на сваё будучае. Часцей за ўсё такія веды не ўсведамляюцца, застаючыся на ўзроўні фонавага пераканання агульнага характару аб магутнасці свайго народа.

11. Аналагічнае мы назіралі пры даследаванні заканамернасцей змены адной рэлігійнай канцэпцыі другой у межах аднаго або некалькіх этнасаў, аб'яднаных адной дзяржавай: умовай перамогі аднаго рэлігійнага сімвала над іншымі з'яўлялася ступень усеагульнасці галоўнага Бога і як вынік ступень яго магутнасці, а іменна: 1) крэатыўныя магчымасці, 2) апекаванне многіх народаў, а не аднаго, 3) залежнасць ад чаго-небудзь і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ